Краеведческий Солигорска

# Нараджаецца другі гігант

У мінулым годзе ў гэту пару тут шумела на ветры збажына. Але надышла восень, прайшло жніво, і ў полі ўзняліся тры вышкі для бурэння замарожваючых шчылін у будучых ствалах шахты. А ў сярэдзіне лістапада былі арганізаваны тры першыя брыгады будаўнічага ўпраўлення № 15.

У хуткім часе пачалі закладвацца фундаменты будынкаў. Ішлі дні. Рос калектыў будаўнікоў. У неба ўзнімаліся першыя карпусы падсобных збудаванняў.

Даводзілася пераадольваць нямала цяжкасцей. Былі затрымкі з дастаўкай раствору і зборнага жалезабетону. Тады пачаў дзейнічаць створаны камітэтам камсамольскай групы (яна налічвала ўсяго 29 чалавек) кантрольны камсамольскі пост. Ен у сігналах «лёгкай кавалерыі» выкрываў віноўнікаў непаладак. Ініцыятарам паста быў малады муляр Іван Навіцкі.

Суровая зіма прыбавіла будаўнікам клопатаў. Тут дапамагла прапанова начальніка ўчастка Віктара Антонавіча Корбута. Каб выратаваць раствор ад замярзання, скрынкі для яго рабілі ў будках-цяплушках. Дзякуючы гэтаму ні адзін грам раствору не прападаў. Працаваць можна было ў любы мароз.

Не пазнаць гэтых месц сёння. Нядаўна будаўнікі здалі ў эксплуатацыю будынкі пад кантору і матэрыяльны склад. Здадзены пад аддзелку шаснаццацікватэрны дом і іншыя аб'екты. Будуюцца кантора калійнага камбіната, другі шаснаццацікватэрны дом, сталовая — усё нават цяжка пералічыць.

Работа вялікая для калектыву будаўнікоў, у якім усяго 100 чалавек. Але месячныя заданні яны заўсёды выконваюць і перавыконваюць. Выдатна працуюць Ніна Храловіч, Уладзімір Малочка, Канстанцін Новік, Аксана Валенцік, Марыя Серавокая і многія, многія іншыя. Гэта нашы маякі, на іх раўняюцца ўсе астатнія. Добрымі працоўнымі поспехамі сустрэлі яны свае свята.

Зроблена ўжо нямала, але трэба яшчэ больш зрабіць. І будаўнікі стараюцца.

**Л. ТРУХАНОВІЧ,**
**групкамсорг БУ-15, наш нештатны карэспандэнт.**

# КЛАДКУ ВЯДЗЕ АНАТОЛЬ СЯМАК

